***Пятро Цалка***

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВЫЯ АДНОСІНЫ Ў АБРАДЗЕ ВАДЖЭННЯ І ПАХАВАННЯ СТРАЛЫ

Прасторава-часавыя адносіны з’яўляюцца адным з дамінантных аспектаў міфалагічнай мадэлі свету. У сучаснай фалькларыстыцы менавіта гэтым катэгорыям надаецца вялікая ўвага з боку навукоўцаў. Даследуюцца асаблівасці хранатопу ў традыцыйных абрадах, лірыцы, казкавай і няказкавай прозе. Самым папулярным раздзелам фалькларыстыкі, да якога звяртаюцца знаўцы традыцыйнай культуры, раскрываючы прасторава-часавыя асаблівасці, з’яўляецца каляндарна-абрадавы фальклор. Менавіта народны каляндар са шматлікімі святамі і прысвяткамі дапамагае ў поўнай меры праілюстраваць даволі складаныя стасункі, у якія ўступаў чалавек з прыродай: небам і зямлёй, сонцам і месяцам, ветрам і дажджом; з багамі, што, паводле ўяўленняў чалавека, насялялі неба, зямлю (лясы і палі, рэкі і балоты, жыллё чалавека і пабудовы для жывёл) і падзямелле. Найбольш важная роля ў гэтых складаных стасунках надавалася святочным дням, якія ўспрымаліся як “незвычайны “сакральны” час, які супрацьпастаўляецца паўсядзённым буднім дням” [4, *226*].

Аб’ектам нашага даследавання з’яўляецца абрад ваджэння стралы, што найбольш распаўсюджаны на тэрыторыі “Пасожжа, а таксама тэрыторыя паміж Дняпром і Прыпяццю” [1, *564*]. Месца найлепшай захаванасці абраду – гэта Веткаўшчына і суседняя тэрыторыя Браншчыны. Але шматлікія звесткі – апісанні абраду і песенныя тэксты зафіксаваны на тэрыторыі ўсёй Гомельшчыны (Веткаўскі, Буда-Кашалёўскі, Добрушскі, Лоеўскі, Чачэрскі, Рэчыцкі, Гомельскі, Нараўлянскі, Жыткавіцкі, Жлобінскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі раёны).

Прадметам нашага даследавання з’яўляецца выяўленне семантыкі абраду ваджэння стралы праз катэгорыі прасторы і часу.

Першае пытанне, якое ўзнікае ў даследчыка пры вывучэнні абраду “Стралы”, датычыцца непасрэдна назвы: ВАДЖЭННЕ ці ПАХАВАННЕ “Стралы”? Адказ знаходзім у расповядах іфармантаў з в. Неглюбка пра абрадавыя дзеянні: “У нашай мясцовасці было Ушэсце. Як 6 нядзель ад Паскі пройдзе, вось тады ўжо **хаваюць стралу.** А да гэтага, да Паскі нікакіх ні зборышч, ні спеваў, ні танцаў не было, нічога. Толькі пост быў. Вялікі пост. А ўжо потым, пасля на ўтарой дзень выходзяць і **водзяць карагоды**, адзяваюцца так у самае харошае, нове, добрае, красівае” [5, *125*]. Такім чынам, мы заўважаем, што змена назвы абраду (ваджэнне або пахаванне) звязана напрамую з часам, калі адбываюцца абрадавыя дзеянні. Пахаванню стралы папярэднічала яе ваджэнне: “Ад Спаса (Вялікадня – П. Ц.) да Ушэсця (Ушэсце – таму, што шэсць нядзель ад Паскі) пелі песні вясны” [5, *89*]. У гэты час (напярэдадні Ушэсця) жанчыны, дзяўчаты збіраліся на вуліцах каля дамоў – у межах **сваёй** вуліцы і спявалі “стрэльныя песні”, вадзілі карагоды. Песні, што выконваліся ў абрадавых дзеяннях былі дакладна такімі ж як і на Ушэсце, але сама прастора выканання песень і карагодаў лакалізавалася на “сваёй” тэрыторыі, на тэрыторыі сваёй вуліцы. Да асноўных “магічных” абрадавых месц (скрыжаванне дарог і жытнёвае поле) дзеянні ў гэты час не даходзілі. Адбывалася своеасаблівая “рэпетыцыя” абрадавых дзеянняў, пік якіх прыходзіўся на **свята Ушэсце**. Як сцвярджаюць даследчыкі, “сярод вясковых жыхароў трывала захоўваюцца традыцыйныя ўяўленні пра свята як незвычайны час, калі патрэбна прытрымлівацца пэўных правіл паводзін…” [4, *227*]. Такім чынам, пры змене **часу,** у які адбываюцца дзеянні (будні-свята), мяняецца **прастора,** ўскладняецца структура дзеянняў, павялічваецца уолькасны склад удзелькаў абраду, з’яўляюцца новыя персанажы (табл. 1).

*Табліца 1*

Месца (прастора) і час у абрадзе

| | **Час ад Вялікадня да Ушэсця (будні)** | **Ушэсце (свята)** |
|---|---|---|
| Месца (прастора) | Вясковая вуліца<br>Месца каля хаты<br>Пагорак | Вясковая вуліца, месца каля хаты, пагорак, скрыжаванне, цэнтр вёскі (каля царквы, каля крыжа, на галоўным скрыжаванні вёскі), жытнёвае поле |
| Абрадавыя дзеянні | Выкананне “стрэльных” песень, песень-вяснянак, песень-“лелюшак”, ваджэнне карагодаў каля вясковых хат | Выкананне “стрэльных” песень, песень-вяснянак, песень-“лелюшак”, ваджэнне карагодаў каля вясковых хат,<br>шэсце па вуліцах ўздоўж вёскі, карагоды на скрыжаваннях, карагоды ў жытнім полі, закопванне абрадавых прадметаў – “пахаванне стралы” (лялька, нітка, пярсцёнак і інш.),<br>“пахаванне старцаў”, святочнае гулянне з застоллем |
| Удзельнікі абраду | Мужчыны і хлопцы (удзельнічаюць, але не выконваюць абрадавыя дзеянні), жанчыны, дзяўчаты | Мужчыны і хлопцы (удзельнічаюць, але не выконваюць абрадавыя дзеянні), жанчыны, дзяўчаты, дзеці, ражаныя – “старцы”, “маладыя”, “цыганы”, “дзеўка-вясна” з лялькай. |

Зыходзячы з абрадавых дзеянняў (ваджэнне і пахаванне), якія выконваліся ўдзельнікамі абраду “Стралы”, усе намаганні прыкладаліся, каб “завесці размову з нябёсамі”, “навесці” кантакт са “стралой”. У шматлікіх песенных тэкстах прыгадваецца **“страла”**, якая ў адных варыянтах **“ідзе”**або **“ляціць”** сама па сабе: “Як **ішла** страла да й удоль сяла, Охі-ой лёлі, да й удоль сяла [5, *89*]; Ды **ідзець** страла / Ды ўдоль

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяла, / Ды ўдоль сяла, / Ды ўдоль вуліцы [5, *89*]; Ты **ляці**, страла, / Да й удоль сяла [5, *92*]; **Ляці,** страла, міма сяла / Ой, лёлюшкі лёлі, / Міма сяла [5, *121]*; **Ляцела** стряла і ўждоўж сяла… [5, *139*]".

У іншым жа выпадку **"стралу"** удзельнікі абраду **"пускаюць", "вядуць", "нясуць": "**Як **пушчу** стралу / Да ўздоўж сяла" [5, *88*]; "**Павядом** стралу па ўсём сялу" [5, *93*]; "**Мы нясом** стралу да й па ўсім сялу" [5, *100*]".

Згодна з вышэйпрыведзенямі назіраннямі, можна зрабіць вывад, што "страла" ў некаторых песенных варыянтах выступае ў некалькіх іпастасях. У адным выпадку – гэта неўтаймаваная стыхія, якая існуе сама па сабе незалежна ад чалавека ("страла" "ідзе", "ляціць" **сама па сабе**). У другім выпадку гэта утаймаваная стыхія, што знаходзіцца ў руках чалавечай супольнасці, што кіруе "стралой" – **"пушчу", "павядом", "мы нясомстралу".**

Такім чынам, падсумаваўшы некаторыя папярэднія звесткі, можна меркаваць, што ў буднія дні, па-за межамі свята, "страла" існавала як неўтаймаваная стыхія, непадуладная чалавеку. А ўжо непастрэдна на Ушэсце чалавек, супольнасць мелі магчымасць кіраваць "нябесным агнём", знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці. Гэтаму меркаванню ёсць некалькі пацвярджэнняў:

Па-першае, Ушэсце з года ў год праходзіць толькі ў чацвер – "мужчынскі" дзень тыдня" [3, *35*]. Даволі магутны па сваіх энергетычных здольнасцях і як адзначаюць даследчыкі "адзіным днём ушанавання магутнага боства (Перуна – П. Ц) у традыцыйных культурах розных еўрапейскіх народаў з'яўляецца чацвер" [2, *325*].

Па-другое, самі выканаўцы абраду ставяць на мэце падчас правядзення абраду "Пахаванне стралы" ўтаймоўваць непадуладную ў звычайны час стыхію: "Стралу хавалі ад маланкі" [5, *148*], "У поле ішлі на жыта, там вадзілі карагоды, качаліся па жыту, закопвалі каласы ў зямлю, каб гром не біў стралой ні жывотных, ні людзей" [5, *150*].

Для больш глыбокага разумення сутнасці асноўных абрадавых дзеянняў звяханых з ваджэннем і пахаваннем "стралы", варта звярнуцца да зместу старажытнага міфа аб тым, што "Пярун змагаўся са змеепадобнай істотай, якая трымала ваду і хавалася пад дрэвам, каменем. Пярун паражаў яе сваімі стрэламі і вызваляў ваду. Пасля перамогі Пяруна нібыта ішоў дождж" [2, *402*]. Узгаданы міф дае падставы для разважанняў і высвятлення многіх таямніц абраду:

**Што за "страла"?**

Страла – міфалагічны вобраз Перуна, бога-грамаўніка, што ўладарыць над усімі багамі. "Лічылі, што Пярун пасылае свае стрэлы агнём, якія паражаюць дрэвы, каменне, людзей" [1, *403*]. З мэтай улагодзіць Перуна, зберагчы сябе, пабудовы, свойскую жывёлу і выконваліся асноўныя дзеянні:

– шэсце "стралой" па вёсцы: "На Ушэсце стралу вадзілі. Ідуць тры-чатыры рады па вуліцы" [5, *89*]; "Бяромся за рукі і ідзем па ўсёй вуліцы, песню пяём" [5, *99*];

– ваджэнне карагодаў на скрыжаваннях: "На базар (скрыжаванне каля магазіна – Ц. П.) заходжаем, становімста храстом і пяём. І ходзім так от па часавой" [в. Перялёўка.]

– ваджэнне карагодаў вакол хаты: "… ідуць у пачатак вёскі і пачынаюць вадзіць карагод вакол кожнага дома. Але гэты карагод абыходзіць толькі тыя хаты, у якіх гаспадары даюць дазвол" [5, *101*];

– ваджэнне карагодаў у жыце: "У жыці танцавалі, карагоды вадзілі, песні спявалі" [5, *95*];

– закапванне "стралы": "Заходзяць у жыта, закопваюць грошы, цэннае, жалезнае" [5, *94*];

– зрыванне каласоў з поля: "Бярэм тры каласкі зрываем і торкаем хто пад страху, хто за вікону. Ета шоб гром не пабіў ні хаты, ні скаціну, ні ваабчэ нічога не трогаў хазяйскага" [в. Казацкія Балсуны.]

Нават само шэсце ў некаторых вёсках інфарманты называлі стралой і прымалі ўдзел у ім дзяўчаты і жанчыны ("… у ім прымаюць удзел толькі дзяўчыны" [5, *101*]), якія стваралі своеасаблівую форму карагода ("стралой") і прымалі на сябе ролю Перуновай стралы: "Яны (дзяўчаты – Ц. П.) збіраюцца гуртам, бяруцца за рукі і атрымліваецца цэп, падобная да стралы, але ў в. Рудня Стаўбунская яе называюць сулой" [5, *101*], "Ішлі стралой па ўсіх вуліцах" [5, *104*]. Згодна з некаторымі павер'ямі, маланка ніколі не закране сваімі "стрэламі" таго, хто ўдзельнічаў у абрадзе, г. зн. быў таксама "стралой", пабратаўся са "стралой":

Такім чынам, сваімі дзеяннямі ўдзельнікі абраду звярталіся да бога-грамаўніка з мэтай "ушанавання, уміласціўлення і ўтаймавання такой магутнай і непрадказальнай сілы прыроды, як маланка, якая пускала на зямлю вогненныя Перуновы стрэлы" [1, *324*]. Да таго ж жанчыны адразу маркіравалі, канкрэтызавалі і месцы, і прадметы, што павінны былі засцерагчы ад "гневу" нябёсаў: вёска ("выводзілі стрялу з сяла"), вуліца ("ідзем па вуліцы, выводзім стрялу"), хата ("пачынаем вадзіць карагод вакол хаты"), поле ("вадзілі карагоды ў полі"), чалавек, свойская жывёла ("торкаем па тры каласы пад страху, за вікону").

**Чаму "страла" "ляціць" сама?**

Страла ў дадзеным выпадку – неўтаймаваная, непадуладная чалавеку дзікая стыхія. Яе выбар падае на каго або на што заўгодна незалежна ад пажаданняў чалавека: "Да й **убі** страла **майго нелюба**. / Да й **убіла** страла добрага **молайца**[5, *218*].

**Чаму "стралу" "вядуць", "нясуць", "пускаюць"?**

Як ужо нам вядома, у тыя старажытныя часы, калі зарадзіўся абрад "стралы", асноўнай рэлігіяй было язычніцтва, якое практыкавала дзеля агульнай бяспекі прыносіць ахвяру, часам і чалавечую, улічваючы, што ахвяра рыхтавалася для галоўнага з багоў – Перуна. Такім чынам, сама супольнасць магла жадаць смерці, ці нават забіць "ахвяру": "Да, забі ж страла, / Вутку, селязня, / Чорнага ворана, / Да добрага молайца" [5, *126*].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам адбывалася звычайная практыка ахвярапрынашэння ў існуючай на той час рэлігіі.

**Чаму "страла" павінна забіць "добра молайца", "каня-воранца", "чорна ворана", "вутку-селязня"?**

Асноўная мэта "стралы" разбудзіць зямлю. Згодна з вышэйпрыведзеным міфам, забіўшы змеепадобную істоту, Пярун вызваляў ваду з недраў зямлі. Такім чынам, атрымліваецца, што зямлю патрэбна было разбудзіць, раскрыць або прымусіць яе раскрыцца. У нашым выпадку ролю "змеепадобнай істоты" выконваюць некалькі істот "конь-воранец", "чорны воран", "вутка-селязень" і нават " добры моладзец". Усе яны выступаюць як ахвяры, якіх павінна прыняць зямля, каб выпусціць ваду са сваіх нетраў: "Як **пушчу стралу** / Па ўсяму сялу, / Ой, і я люлі, / Па ўсяму сялу. / Ты **ляці, старала,** / Да й уздоўж сяла. / Ты ***удар,*** **срала,** / **Добрага молайца.** / Па тым моладцу / Некаму **плакаці:** / Маці старая, / Сястра малая, / Жана малада / Каля горада. / Дзе маці **плача,** / Там ***рака цячэ,*** /Дзе сятрычанька – / Там ***крынічанька,*** / Дзе жонка **плача –** / Там **расы няма.** / […] / Як **пушчу стралу** / Па ўсяму сялу, / Ты **ляці, старала,** / Да й уздоўж сяла. / Ты ***убі,*** **срала,** / **Добрага молайца.** / Па тым моладцу / Некаму **плакаці:** / Маці старая, / Сястра малая, / Жана малада / Каля горада. / Дзе маці **плача,** / Там ***калодзежы,*** / Дзе сятрычанька – / Там ***рака цячэ,*** / Дзе жонка **плача –** / Там **расы няма,** / Конь травы не есць, / Капытамі **б'е,** / Пад сябе грабе, / ***Ваду дастае*** [6, *214–216*]".

З дапамогай шматлікіх рытуальных дзеянняў, песенных складаючых абраду яго ўдзельнікі вяртаюць у нашу сучаснаць той мінулы міфічны час, калі цуд лічыўся звычайнай з'явай, калі чалавек імкнуўся кіраваць прасторай і часам – прадказваючы хутчэйшы надыход той або іншай пары года, мадэлюючы прастору свайго існавання і абараняючы яе ад непажаданых сіл звонку.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – "Яшчур" / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2006. – 832 с.
2. Катовіч, А. Веснавыя святы: нарысы. У 2 кн. Кн. 1 / Рэдкал.: А. Катовіч, Я. Крук; маст. У. У. Васюк, А. Л. Баранаў. – Мн. : Маст. літ., 2005. – 359 с.
3. Катовіч, А. Веснавыя святы: нарысы. У 2 кн. Кн. 2 / Рэдкал.: А Катовіч, Я. Крук; маст. У. У. Васюк, А. Л. Баранаў. – Мн. : Маст. літ., 2005. – 413 с.
4. Кухаронак, Т. Свята ў кантэксце традыцыйнай культуры беларусаў / Т. Кухаронак // ARCHE. – 2011. – № 7, 8. – С. 226
5. Новак, В.С. Абраднасць і паэзія "пахавання стралы" / В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф.Скарыны, 2002. – 269 с.
6. Новак, В.С. Каляндарна-абрадавая паэзія Гомельшчыны (да праблемы лакальнага, рэгіянальнага, агульнанацыянальнага ў фальклоры) / В. С. Новак. – Гомель : Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», 2001. – 233 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ